# ПОЗНАНЬ ЗАПРАШАЕ ПРАМЫСЛОЎЦАЎ І ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

**У Познані — выставачнай сталіцы Польшчы — 8 чэрвеня адкрыецца найбуйнейшая ў гэтай краіне Міжнародная прамысловая выстава «ITM POLSKA — Інавацыі. Тэхналогіі. Машыны», удзел у якой возьмуць больш за тысячу фірмаў амаль з трыццаці краінаў свету.**



Як гэта відаць з назвы самой выставы, акцэнт у яе экспазіцыі робіцца на дэманстрацыю інавацыйных працэсаў і тэхналогій — у васьмі тэматычных раздзелах: ад сыравіны, прадукцыі і абсталявання для металургічнай прамысловасці да тэхнікі апрацоўкі паверхняў, гальванікі, зваркі, напылення, лакіравання і кантрольна-вымяральных прыбораў, Наведвальнікі гэтага дзелавога форума азнаёмяцца таксама з экспазіцыяй трох спецыялізаваных салонаў: «Транспарт для прамысловасці», «Навука для эканомікі», «Ахова працы ў прамысловасці». Арганізатары выставы прадугледзелі таксама ў дзелавой праграме цэлы шэраг спецыяльных прэзентацый: «Парк гідраўлікі і пнеўматыкі», «Інавацыйнасць на практыцы», «Парк ліцейнай справы», «Транспарт XXI стагоддзя», «Акадэмія зваркі».

Чакаецца, што гэты форум прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў наведаюць больш за дваццаць тысяч спецыялістаў, у тым ліку з Беларусі. У чарговы раз дэлегацыю беларускіх дзелавых колаў для наведвання «ITM — Інавацыі. Тэхналогіі. Машыны» фарміруюць Саюз юрыдычных асобаў «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва» і грамадскае аб'яднанне «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў». Удзельнікі гэтай паездкі змогуць скарыстацца на тэрыторыі выставы стэндам для прэзентацыі інфармацыі аб сваіх прадпрыемствах. Арганізатары выезду рыхтуюць таксама адмысловы буклет на польскай, англійскай і рускай мовах пра беларускіх прадпрымальнікаў, зацікаўленых у наладжванні міжнароднага дзелавога супрацоўніцтва. Гэты буклет будзе распаўсюджаны сярод экспанентаў і наведвальнікаў «ITM — Інавацыі. Тэхналогіі. Машыны».

Больш падрабязна пра гэты дзелавы форум і ўдзел у ім дэлегацыі беларускіх дзелавых колаў можна даведацца ў Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва і Мінскім сталічным саюзе прадпрымальнікаў і працадаўцаў па тэлефонах у Мінску: (017) 298 24 46, 298 24 38.

**Барыс ЗАЛЕСКІ.**



**Такой убачылі выставу «ITM — Інавацыі. Тэхналогіі. Машыны» беларускія прадпрымальнікі летась.**

